**К. Максімовіч**

# ГІСТОРЫЯ МАЁЙ СЯМ’І: СТОЛ-РАТАВАЛЬНІК

Падзеі ваенных часоў не раз станавіліся тэмай для ўспамінаў шматлікай радні па мамінай лініі ў вёсцы маёй прабабулі, калі для мяне пачыналі гучаць малавядомыя пытанні пра жыццё ва ўмовах вайны і германскай акупацыі Беларусі. З дзяцінства мне даводзілася чуць расповяд пра стол с гладкай адтулінай, але матуля не спяшалася раніць маю дзіцячую душу вельмі кранальнымі і да ўсяго балючымі ўспамінамі. Мы зноў і зноў збіраліся разам, з каморы прыносілі дадатковы стол, вельмі цяжкі, але сямейны, засцілалі абрусам. І калі гэта здаралася, я зноў бачыла збоку ў стале акуратную гладкую адтуліну.

І вось расповед бабулі. На стале ляжала даволі тоўстая кніга “Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Драгічынскага раёна”, у якой былі сабраны дакументальныя сведчанні відавочнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Тады ў маіх думках пачаў складвацца пазл. Бабуля расказала мне гісторыю пра дзяўчынку Марыю, маю прабабулю, якая цудам засталася жывая пасля фашысцкага расстрэлу. Яна нарадзілася ў вёсцы Бездзеж, шчаслiва жыла ў дружнай вялікай сям’і, але з прыходам немцаў усё змянілася. Была ліквідавана сістэма органаў Савецкай улады. Карныя органы акупантаў выяўлялі савецкіх патрыётаў і ўчынялі над імі крывавыя расправы: знішчалі яўрэйскае насельніцтва, расстрэльвалі камсамольцаў, дэпутатаў, акружэнцаў-чырвонаармейцаў. У многіх населеных пунктах дзейнічаў каменданцкі час: з 19 вечаара да 8 гадзін раніцы забараняліся ўсялякія пераходы і пераезды без спецыяльнага дазволу. Тых, хто не падпарадкоўваўся гэтаму і іншым загадам,

чакала смяротная кара. Тое ж чакала і тых, хто ўкрываў камуністаў, савецкіх актывістаў і сем'і партызан. Але мясцовае насельніцтва паўсюдна аказвала ім актыўную падтрымку. Нямала было праведзена паспяховых баявых аперацый дзякуючы своечасовай інфармацыі, перададзенай народным мсціўцам.

Сям'я маёй прабабулі была расстраляная паліцаямі 9 студзеня 1943 г. як сям'я савецкіх актывістаў. Сама ж Марыя цудам выратавался. Гэта гісторыя звязана якраз з адтулінай у нашым сямейным стале: аказваецца, калі немцы ўварваліся ў хату і пачалі страляць, перапалоханая Марыя забілася пад стол. Адна з куль прабіла стол наскрозь і трапіла ў дзяўчынку, але раненне было не смяротным. Стол да гэтай пары стаіць у каморы як сямейная рэліквія, як успамін пра жудасныя часы ваеннага ліхалецця, калі жыццё літаральна вісела на валаску.

Як бачна, вялікая перамога над моцным і каварным ворагам была заваявана дарагой цаной. Удзячныя нашчадкі ніколі не забудуць подзвіг савецкіх воінаў і партызан, здзейснены дзеля свабоды і незалежнасці нашай зямлі, а таксама пра вялікую колькасць пацярпелых ад вайны.